# Аплату працы трэба ўдасканаліць

***Як паведаміла прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы, 15 снежня 1999 года Прэзідэнт А.Лукашэнка прыняў з дакладам прэм'ер-міністра С.Лінга.***

С.Лінг паведаміў аб выкананні за 11 месяцаў бягучага года найважнейшых паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. У прыватнасці, адзначана, што рост ВУП выйшаў на тэмпы, зацверджаныя прагнозам на гэты год.

Прэм'ер-міністр праінфармаваў Прэзідэнта аб выкананні даручэнняў, што датычаць удакладнення праектаў бюджэту і асноўных параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Выконваючы ўказанні Прэзідэнта, С.Лінг унёс прапановы па ўдасканаленню аплаты працы і правядзенню выплат у снежні работнікам бюджэтнай сферы. Плануецца, што змяненні ў сістэму аплаты працы будуць унесены з 1 студзеня 2000 года з тым, каб заработная плата адпавядала рэальнай эканамічнай сітуацыі дзяржавы, адзначаецца ў паведамленні прэс-службы.

Адзначыўшы асаблівую важнасць гэтага пытання, даручыў у бліжэйшы час правесці нараду і дэталёва разгледзець праблемы аплаты працы.

**БЕЛТА.**

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ